ЛІТАРАТУРА

1. **Баренбаум И.Е.** Книга как объект восприятия // Художественное восприятие: Основные термины и понятия: (Словарь-справочник). Тверь. 1991. С. 31—32.

2. Книга: Энциклопедия / Редкол.: И.Е.Баренбаум, А.А.Беловицкая, А.А.Говоров и др. М.: Большая Рос. энциклопедия, 1998. С. 429—431.

3. **Михайловская А.И.** Музейная экспозиция (организация и техника). М.: Сов. Россия, 1964. С. 266—267.

4. Музееведение. Музеи исторического профиля: Учеб. пособие для вузов по спец. "История" / Под ред. К.Г.Левыкина, В.Хербота. М.: Высш. шк., 1988. С. 195—198, 209—210.

5. **Одрованж-Пененжек Я.** Проблемы построения экспозиции в литературном музее // Современные литературные музеи: Некоторые вопросы теории и практики. М., 1982. С. 123—133. (Сб. науч. тр. / НИИ культуры; № 111).

6. Lexikon der Buchkunst und Bibliophilie / Hrsg. von K.K.Walther. Leipzig: Bibliogr. In-t, 1987. S. 119.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***Клімаў І.П. (Мінск)***

# ТЭХНАЛОГІЯ ДРУКАВАННЯ КНІГ І АРГАНІЗАЦЫЯ КНІГАВЫДАННЯ Ў ЕЎРОПЕ XVI ст.

## 1. Тэхналогія друкавання кніг

У аснове еўрапейскага кнігадруку да XVIII ст. ляжалі два тэхнічныя вынаходніцтвы, зробленыя яшчэ да Гутэнберга: вертыкальны друк (адбітак шляхам ціснення) і наборны (рухомы) шрыфт, які мог рассыпацца і перанабірацца ў розных камбінацыях. Знаходка Гутэнберга палягала ў замене драўляных літар на металічныя, якія досыць проста і хутка адліваліся ў спецыяльных формачках. З дапамогай металічнага шрыфту можна было зрабіць тысячы адбіткаў, перш чым метал пачынаў псавацца.

У арганізацыйных адносінах кнігадрукаванне ў XVI ст. было буйным і складаным мерапрыемствам, якое не мог здзейсніць толькі адзін чалавек. Працэс кнігадруку складаўся з некалькіх стадый, на кожным яго этапе дзейнічалі свае спецыялісты. Гэты працэс нават і на перыферыі Еўропы (напрык-

лад, у славянскіх землях) мусіў набываць тыя ж арганізацыйныя формы, што і ў буйных цэнтрах кнігадруку.

На першай стадыі адбывалася адліўка літар і іншых матэрыялаў друкарскай формы (г. зв. манкармэнту): шпацый, квадратаў, шпонаў, марзанаў (матэрыял для запаўнення палёў), лінеек і інш. Займаўся гэтым спецыяльны майстар — гісар (ліцейшчык, адліўшчык), якому заказчык шрыфту (ініцыятар выдання, гаспадар друкарні) даваў малюнак літар. Пры гэтым разлічваліся такія моманты будучага выдання, як шчыльнасць літар у радку і радкоў на паласе, стасункі літар з надрадковымі знакамі (якія маглі адлівацца асобна ад літар ці разам, у адзін наборны элемент). Таксама на гэтым этапе вызначаўся фармат выдання, для якога меў ужывацца гэты шрыфт, памер паласы набору і палёў, паколькі гарманічныя суадносіны паміж шрыфтам і старонкай кнігі спрыялі лёгкасці чытання.

Працэс вырабу шрыфту пачынаўся з гравіравання пуансона — металічнага бруска з рэльефнай выявай літары. Часта гравіроўкай пуансонаў займаўся сам гісар, але ў буйных цэнтрах Італіі і Германіі гэтую працу выконваў асобны гравёр. З дапамогай пуансона ў гліне выціскалася матрыца, якая і служыла формай для адліўкі літар. Матрыца мела звычайна форму адсечанай пірамідкі, якая распадалася на дзве паловы. У вусце вяршыні пірамідкі залліваўся расплаўлены метал. На набор нават адной кнігі было патрэбна шмат літар — сотні, тысячы адлівак з матрыцы.

Больш распаўсюджанай была практыка адліўкі літары з надрадковым знакам, дзеля чаго ў матрыцы літары было дастаткова выціснуць асобным пуансонам надрадковы знак. Пры адліўцы надрадковых знакаў асобна ад літар трэба было ўводзіць між радкамі асобны радок, які апрача надрадковых знакаў запаўняўся прагальным матэрыялам — шпонам. Да такой адліўкі звярталіся, звычайна, у тым выпадку, калі правілы пастаноўкі надрадковых знакаў былі невядомы выдаўцам (напрыклад, пры друку кніг на чужыннай мове).

У адрозненне ад шрыфту фігурнае і арнаментальнае аздабленне кнігі (застаўкі, ініцыялы, гравюры і да т. п.) выразалася з дрэва. Пры гэтым вышыня вырэзнай выявы на дошцы рабілася роўнай вышыні металічных літар. Займаўся рэзаннем іншы майстар — гравёр (разьбяр, рэзчык). Калі тыраж кнігі быў вялікі, то драўляны (а часам і адліўны) элемент набору

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

шкодзіўся і яго прыходзілася рамантаваць або замяняць на новы (адсюль, дарэчы, і адрозненні ў тыражы аднаго выдання).

Звычайна, друкарні сваіх рэзчыкаў, гісараў, гравёраў не мелі, а набывалі адліўны і вырэзны элемент у чужых. Нават у Празе, самым буйным выдавецкім цэнтры на славянскіх землях, друкарні куплялі шрыфты, гравюры і застаўкі ў Нюрнбергу, вядомым цэнтры вытворчасці гэтай прадукцыі. Звычайнай практыкай быў гандаль спажытымі шрыфтамі ці дрэварытамі, якія цалкам ці са зменамі маглі ўжывацца пры іншых выданнях, калі іх выдаўцу бракавала сродкаў на новыя прылады. У любым выпадку наяўнасць ілюстрацый і розных аздоб рабіла выданне больш дарагім.

Вырабляць увесь друкарскі матэрыял самой друкарні было значна цяжэй і даражэй, чым купляць у чужых. Друкарня як камерцыйнае прадпрыемства выконвала самыя разнастайныя заказы розных кліентаў: дзяржаўных канцылярый, царкоўных і рэлігійных арганізацый, гарадскіх грамад, прыватных асоб і да т. п. Пры гэтым якасць выканання мусіла, па меншай меры, задавальняць кліента, а кошт заказу не мог істотна пераўзыходзіць сярэднія паказчыкі "ў галіне". Выраб для кожнага заказу, напрыклад, усяго вырэзнага элементу мог не толькі адмоўна адбіцца на якасці выдання, але і значна падвысіць яго кошт. Таму найчасцей друкарні на перыферыі Еўропы абсталёўваліся чужым друкарскім матэрыялам, набытым за мяжой ці ад папярэдніх друкароў.

На другой стадыі ў працу ўступаў іншы майстар — зэцар (ці зіцар, наборшчык), які набіраў адліўны і вырэзны элемент (т. ч. утваралася паласа набору) у друкарскую форму. Яе аб'ём быў роўны старонцы або дзвюм, г. зн., разгорнутай старонцы. Гэтыя формы раскладваліся па паліцах у чаканні друку. За светлавы дзень зэцар у залежнасці ад фармату і складанасці тэксту набіраў адну-дзве формы. Прыблізная вытворчасць дзённай працы наборшчыка складала 3—5 тыс. наборных знакаў. Паласа набору выдання фарматам in quarto ($4^0$) мела ў сярэднім 1 тыс. знакаў, фарматам in folio ($2^0$) — 1,5—2 тыс. знакаў. Хуткасць набору ды друку аднаго тэксту ў розных фарматах была аднолькавая, але вялікафарматнае выданне патрабавала больш шрыфту на набор, чым малафарматнае. Гэта абумоўлена тым, што перад пачаткам друку набіралася,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

звычайна, некалькі дзесяткаў старонак, а пры наяўнасці наборных сродкаў — і ўся кніга. Тым не менш, старонкі набіраліся паслядоўна, адна за адной, і пачатак тэксту наступнай старонкі паказваўся пры дапамозе кустодаў (некалькі літар першага слова наступнай старонкі). Кустоды ж дапамагалі потым пры падборы аркушаў падчас брашуравання.

Роля зэцара была найбольш адказнай у кнігавыданні. Ён мусіў быць чалавекам пісьменным, хаця і не абавязкова ведаць тую мову, на якой набіраўся тэкст. Пры наборы зэцар сачыў не столькі за правільнасцю набіранага тэксту, колькі за тэхнікай набору: каб шрыфт і застаўкі стаялі належным чынам, каб манкармэнт не запэцкаў паперу і да т. п.

Перад друкам неабходна было назапасіць паперы або дамовіцца аб яе цвёрдых пастаўках. У залежнасці ад фармату набытай паперы вызначалі, як стане фальцавацца (згінацца) будучае выданне — у аркуш, палову ці чвэрць аркуша (зрэдку, пры вялікім фармаце аркуша, ужывалі фальцаванне ў восьмую, шаснаццатую і больш частку аркуша). Фальцаванне азначала, колькі палос (старонак) будзе адбівацца на адным баку аркуша за адзін прагон пад друкарскім варштатам. Адбітыя аркушы перагіналі пасярэдзіне (калі яны былі сфальцаваны ў палову) ці яшчэ раз пасярэдзіне (калі ў чвэрць) і ўкладалі адзін у адзін, атрымліваючы двухлістовы (калі фальцавалі ў аркуш), чатырохлістовы (калі ў палову) ці васьмілістовы (калі ў чвэрць) сшытак адпаведна, у 4, 8 ці 12 палос.

На трэцяй стадыі адбываўся сам друк. Друкарскі варштат уяўляў сабой масіўнае драўлянае збудаванне ў выглядзе літары П, ножкі якога прымацоўваліся да падлогі. Паміж бакавымі апірышчамі клаліся дзве папярочкі, пасярэдзіне якіх устаўляўся тоўсты металічны вінт — шруба, што рухалася толькі ўверх ці ўніз. Рух шрубы ажыццяўляўся пры дапамозе спецыяльнага рычага — вагі. Перад працай друкарскія формы складаліся ў фальцоўную раму, якая была прымацавана да парэлі — рухомай дошкі. Парэль падавала форму пад націскную дошку — тынгель, які прымацоўваўся да шрубы. Шляхам націску тынгеля на парэль і адбываўся друк паперы. Але перш чым ціснуць ім на парэль трэба было падрыхтаваць паперу для друку. Дзеля гэтага на фальцоўную раму са змешчанымі ў ёй формамі набівалі фарбу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Набіўка фарбы здзяйснялася спецыяльнымі скуранымі мяшочкамі (падушачкамі) — мацамі. Гэтым займаўся асобны майстар — фарбар. Папярэдне сухую фарбу ён расціраў з дададзеннем вадкасці на каменнай пліце з гладкай паверхняй. Фарбы ішло на друк даволі шмат, таму фарбарам даводзілася сачыць за якасцю і колерам кожнай новай порцыі фарбы.

Паперу клалі не адразу на фальцоўную раму, а спачатку накладалі на здымную драўляную рамку (цімпан), абцягнутую скурай, да якой паперу прыколвалі іголкамі, каб яна не пакамечылася. Паверх паперы накладалі пергамінную (пазней металічную) плоскую маску, якая мусіла прыкрываць палі, каб яны не запэцкаліся фарбай. І толькі потым рамку з прыколанай паперай клалі на фальцоўную раму і рабілі друк. Усе гэтыя аперацыі выконваў асобны майстар — імпрэсар (выбойнік). Пры адсутнасці фарбара яму даводзілася таксама набіваць фарбу.

Пасля пад'ёму тынгеля парэль вывозілася (пры дапамозе калавароту) для далейшых аперацый: здымання цімпана, замены на ім паперы разам з новай набіўкай фарбы. Калі праз фальцоўную раму праходзіла ўся партыя аркушаў, з яе вымалі адбітыя формы і ўкладалі новыя, прапускаючы затым наступную партыю аркушаў.

Сярэдняя вытворчасць друкарскага варштату складала 1—1,3 тыс. адбіткаў на дзень; у нямецкіх і італьянскіх друкарнях гэтая норма дасягала 2 тыс. адбіткаў. У залежнасці ад аб'ёму і тыражу кнігі, яе друк мог цягнуцца паўгода і больш. Лёгка здагадацца, што праца імпрэсараў была вельмі напружанай, асабліва пры тэрміновым заказе. Колькасць імпрэсараў у друкарні залежала ад вытворчасці друкарскага варштату і колькасці варштатаў, аднак адзін варштат, звычайна, абслугоўвалі толькі імпрэсар і фарбар.

Але перш чым запусціць у варштат увесь тыраж, першы адбітак з кожнай формы аддаваўся карэктару, які выпраўляў усе памылкі набору, а таксама сачыў за якасцю друку (прапарцыйнасць, рубрыкацыя, прагалы, запэцканасць і да т. п.). Карэктар пазначаў памылкі і хібы спецыяльнымі знакамі на палях і аддаваў адбітак зэцару, які рабіў неабходныя замены. Зрэдку зэцар і сам мог быць карэктарам, але даволі часта абавязкі карэктара выконваў заказчык (асабліва калі друкарня выдавала тэкст на чужой мове).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На апошняй стадыі аддрукаваная папера выкладалася на прасушку побач з варштатам або ў спецыяльным памяшканні (звычайна, яе развешвалі на вяроўках). Прасушаныя аркушы зноў ішлі на прагон з другога боку і потым вярталіся на новую прасушку. Затым яны траплялі або на склад або адразу ў сшывальню, дзе іх брашуравалі (паводле кустодаў і сігнатур) інтралегатары (брашуравальшчыкі) у сшыткі ці ў блокі (некалькі сшыткаў). Якраз у час брашуравання і магла здарацца блытаніна аркушаў або сшыткаў у складзе кнігі. Сшытая цалкам кніга абрэзвалася нажом на спецыяльным варштаце, таму з разлікам на абрэзку ў кнігах таго часу на старонцы пакідаліся шырокія палі.

Менавіта ў такім брашураваным выглядзе заказ і здаваўся гандляру ці заказчыку; пры гэтым заказ маглі выдаваць асобнымі партыямі, па меры выканання ўсяго тыражу. Але заказчык мог атрымаць несфальцаваныя і неабрэзаныя аркушы, перавязаныя ў стосы без разбору пагінацыі. Звычайна, так рабілася ў дачыненні да замежных заказчыкаў, якім трэба было транспартаваць тыраж на адлегласць.

Кнігі прадаваліся, звычайна, без вокладак, таму іх першыя і апошнія старонкі часта шкодзіліся, з той прычыны пакідалі некалькі чыстых аркушаў напачатку і ў канцы кнігі. У той час вокладка выдання была клопатам яе ўладальніка, паколькі яна павялічвала кошт кнігі ў 2—3 разы, што, зразумела, замаруджвала яе рэалізацыю. Тым не менш, пэўная частка тыражу прапаноўвалася пакупнікам і ў вокладцы.

Пры продажы кнігі 100 % надбаўка да яе кошту была нармальнай з'явай у кніжным гандлі. Кнігі каштавалі адносна дорага (кошт авечкі ці мяшка збожжа), але ў цэлым былі даступны нават сярэдняму мяшчанству. З развіццём кнігадрукавання друкарскія кошты паступова паніжаліся. Падзенне цэнаў на кнігі спрыяла росквіту кнігадрукавання, паколькі аб'ёмы продажу ўзрасталі, і гэта вяло да новых заказаў.

Сярэдні тыраж друкаванай кнігі ў Еўропе складаў 1000 паасобнікаў, малы — 400—500, вялікі дасягаў 3000—5000 паасобнікаў. Апрача таго, мелі месца дадрукоўкі тыражу з тым самым тытульным лістом, але часта з невялікімі зменамі ў тэксце ці афармленні. З фінансавых прычын для кніг, што карысталіся вялікім попытам, практыкавалі перавыданні, а не выпуск іх вялікім тыражом.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адны выданні адпачатку былі разлічаны на вываз у суседнія рэгіёны, іншыя распаўсюджваліся пераважна на месцы. Існавалі купцы, якія спецыялізаваліся амаль выключна на гандлі кнігамі; іх дзейнасць, звычайна, мела міжрэгіянальны маштаб. Кнігі везліся вазамі або караблямі; перавозка не надта павялічвала цану кнігі. Для рэалізацыі друкаванай кнігі існавала разгалінаваная сістэма оптавага і дробнага гандлю, са сваімі складамі, экспедытарамі і тавараведамі. Важнейшым пунктам гэтай сістэмы былі кірмашы, якія часта давалі збыт усяго тыражу. Апрача кірмашоў кнігі прадаваліся ў лаўках ці крамах, разам з іншымі таварамі; кнігарні як спецыялізаваныя крамы былі яшчэ даволі рэдкай з'явай.

Дзеля збыту кнігі ў ходу былі рэклама, легенда друкарні (напрыклад, славутасць Альдзінаў была важным фактарам пры рэалізацыі прадукцыі гэтай друкарні) і нават падман пакупніка (напрыклад, фальшаванне выхадных звестак выдання). Пры адсутнасці паняцця і аховы аўтарскіх правоў па ўсёй Еўропе была пашырана практыка пірацкіх выданняў і адначасовых перавыданняў (напрыклад, па таннейшай цане). Гэта складала вялікі клопат для выдаўцоў.

### 2. Арганізацыя кнігавыдання

На кнігадрукаванне мінулых стагоддзяў часта глядзяць як на культурна-асветніцкую дзейнасць. На самой справе яно было ў большасці выпадкаў толькі сродкам зарабіць грошы, г. зн. бізнесам у сучасным разуменні. Стала друкарства заводзілася толькі ў тым рэгіёне, дзе друкаваную кнігу можна было з прыбыткам прадаць. Зразумела, існавала мажлівасць публікацыі ў якасці ахвяравання ці з альтруізму, але ў звычайным выпадку друкар прыходзіў толькі тады, калі існаваў рынак для яго прадукцыі. Кнігі друкаваліся з разлікам на іх продаж, таму наяўнасць выдання, а асабліва перавыдання кнігі друкам сведчыць аб цікавасці публікі да дадзенай публікацыі.

Пры высокіх аб'ёмах капіталаўкладанняў кнігадрук усюды прыцягваў вольныя капіталы, паколькі даваў адну з самых высокіх нормаў прыбытку. Нядзіўна, што "галактыка Гутэнберга" год ад году павялічвалася ў памерах, асвойваючы новыя рэгіёны. У такіх цэнтрах еўрапейскага кнігавыдавецтва, як Венецыя ці Антверпен, адначасова дзейнічалі каля дзесятка

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

друкарань. Нават у Празе і Кракаве адначасова існавалі 2—4 друкарні. Найбольш буйнымі цэнтрамі друкавання ў Еўропе XVI ст. былі Венецыя, Парыж, Антверпен, дзе штогод выходзілі сотні выданняў. Значнымі цэнтрамі былі Ліён, Базель, Кёльн, Страсбург, Нюрнберг і інш.

У працэсе кнігадрукавання можна вызначыць тры бакі, што ўзаемадзейнічалі паміж сабой: заказчык выдання (напрыклад, аўтар кнігі), майстар-друкар — выканаўца заказу і, нарэшце, гаспадар друкарні. У адных выпадках майстар-друкар быў і гаспадаром сваёй друкарні, у іншых гэтыя ролі не сумяшчаліся.

У Заходняй Еўропе звычайна друкар быў гаспадаром друкарні. Аднак нярэдкімі былі выпадкі, калі ўладальнік (фундатар) друкарні наймаў друкара дзеля выдання пэўнай кнігі (ці кніг). Тады іх функцыі дакладна акрэсліваліся ў кантракце, за парушэнне ці скасаванне якога можна было спагнаць кампенсацыю. Таму любая друкарня абавязкова пачыналася з юрыдычнага афармлення адносін у выглядзе кантракту.

Ва Усходняй Еўропе гаспадар друкарні і друкар доўгі час заставаліся рознымі асобамі; фундатар друкарні мог наймаць розных друкароў на выраб аднаго ці некалькіх выданняў. Гэта было звязана з дэфіцытам свабодных капіталаў у славянскіх краінах (напэўна, за выключэннем Чэхіі) пры дастаткова высокай рызыцы рэнтабельнасці кнігавыдавецкай вытворчасці. Таму практычна ўсё XVI ст. друкарні тут заводзілі пераважна тыя ўстановы ці асобы, якія мелі лішак капіталу: цэнтральная ўлада, манастыры, манаскія ці мяшчанскія карпарацыі, магнаты.

Звычайна, у якасці гаспадара выступалі: адна асоба ці сям'я, калектыў (манастыр, брацтва, грамада і да т. п.) або ўстанова (урад, магістрат і інш.). Гаспадар мог сам весці фінансавыя разлікі з кліентамі і пастаўшчыкамі, а мог перадавераць гэта свайму прыказчыку (менеджэру). Пры адсутнасці заказчыка ініцыятарам выдання станавіўся сам гаспадар друкарні. Тады ўся рызыка па выпуску выдання ў свет ускладвалася на яго плечы.

Функцыі гаспадара друкарні былі бадай што самыя адказныя, асабліва на пачатку яе дзейнасці. Гаспадар друкарні наймаў памяшканне для друкарні (або аддаваў ёй сваё), набываў (радзей браў у арэнду) друкарскае абсталяванне і шрыфт (калі ён не быў спецыялістам, то ад яго імя гэта рабіў сам майстар-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

друкар), наймаў працаўнікоў і, нарэшце, фундаваў абаротны капітал у друкарскае прадпрыемства (закупка дрэварытаў, паперы, фарбы). Найвялікшы кошт пры друку мела папера, якая забірала да 50 % выдаткаў на само выданне. З іншых коштаў вялікая доля (да 40 %) прыпадала на аплату працы друкара.

Найбольш дарагой часткай друкарні з'яўляўся шрыфт, які быў патрэбны ў значнай колькасці літар для набору аднаго выдання. Звычайна, кошт шрыфту пераўзыходзіў у 100 разоў кошт друкарскага варштату. Найдаражэй каштавалі шрыфты для выдання in folio, ужо для выдання памерам in quarto іх кошт быў удвая ніжэйшы, а для in octavo — у чатыры разы. Для выдання sexto-decimo кошт мог складаць толькі дзесятую частку ад кошту для folio. Нядзіўна, што octavo і quarto былі найбольш распаўсюджанымі ў Еўропе. Вялікі фармат выбіраўся толькі для літургічных, юбілейных і ўрачыстых выданняў, поўных біблій і да т. п.

Дзеля выпуску выдання перш за ўсё трэба было разлічыць рынак збыту (нават у Празе друкарні маглі прастойваць месяцамі) і сабекошт выканання заказу. Паколькі друкарня, асабліва напачатку сваёй дзейнасці, была капіталаёмкім прадпрыемствам, то нават заможны прадпрымальнік быў вымушаны канцэнтраваць калектыўны капітал. Адбывалася гэта шляхам пазыкі пад працэнты або долевага ўдзелу. Часам гаспадар друкарні падзяляў кошт выдання з іншым фундатарам у абмен на права продажу часткі будучага тыражу. Але гэта магло быць зроблена звычайна толькі ў дачыненні да кніг, што добра разыходзіліся: літургічныя тэксты, малітоўнікі, буквары, бібліі і да т.п.

Важнейшай падтрымкай у рэнтабельнай дзейнасці друкарні служылі розныя прывілеі, якія атрымліваліся ад цэнтральных або мясцовых улад. Прывілей даваўся на эксклюзіўны або пераважны выпуск аднаго ці некалькіх выданняў або любых выданняў у пэўнай галіне ці на пэўнай мове. Гэтым самым усім іншым друкарам забаранялася выпускаць адзначаныя прывілеем выданні, на некалькі гадоў ці нават бестэрмінова. Праўда, прывілей не мог абараніць яго атрымальніка ад пірацкіх, ананімных выданняў, якія здзяйсняліся нелегальна. Тым не менш, прывілеі служылі дзейсным сродкам у канкурэнтнай барацьбе на друкарскім рынку, выступаючы свайго роду гарантам прыбыткаў і аўтарскіх праў. На атрыманне прывілеяў выдаўцы (ці друкары) часта клалі вялікія намаганні. Атрыманы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прывілей станавіўся сапраўдным здабыткам і мог пераходзіць у спадчыну разам з друкарняй.

Калі не сам гаспадар друкарні, то майстар-друкар займаліся падборам персаналу і каардынацыяй яго працы ў друкарні. Дзеля гэтага трэба было дасканала ведаць саму тэхналогію друку, таму майстар-друкар меў асвоіць спецыяльнасці і зэцара, і імпрэсара, і фарбара, і інтралегатара. Але ў друкарні ён стала працаваў у адным кшталце, звычайна, зэцарам ці імпрэсарам. Найчасцей друкар быў адукаваным чалавекам, нярэдка — з універсітэцкай адукацыяй. Друкарская прафесія ў грамадскай свядомасці XVI ст. не ганьбіла асобу чалавека і не прыніжала нават шляхецкага стану.

Здабыткам друкара часам з'яўлялася якое-небудзь абсталяванне ці інструмент (найчасцей гэты быў шрыфт), што пры пераездзе вазіліся за сабой, або рэцэпт фарбы ці веданне пэўнай тэхналогіі, якая паляпшала друк. Гэты свайго роду "сакрэт фірмы", тагачасны know-how заставаўся ўласнасцю майстра (што абавязкова агаворвалася ў кантракце з гаспадаром друкарні), і майстар пасля заканчэння кантракту забіраў яго з сабой. Таму друкарства часта было сямейнай справай, атуленай патаемнасцю, а шлюбам друкары часта браліся з друкарскімі сем'ямі, удовы ж друкароў часта выходзілі за друкароў.

Знайсці спецыялістаў для друкарні было нескладана; іх заўсёды можна было запрасіць з-за мяжы. У Германіі і Італіі заўжды меўся лішак выдатных друкароў, які гэтыя краіны пастаўлялі астатняй Еўропе. Наогул, большасць друкароў у Еўропе былі прыхаднямі, не мясцовымі ўраджэнцамі. Звычайна, яны прывозілі сваю друкарню і стала пасяляліся ў горадзе, абзаводзячыся сям'ёй. Радзей сустракаліся вандроўныя "каманды", што збіраліся вакол аднаго майстра-друкара, якія і прапаноўвалі свае паслугі таму ці іншаму фундатару друкарні. Такія каманды наймаліся цалкам і маглі існаваць дзесяцігоддзямі, пераходзячы на чале са сваім майстрам-друкаром з адной друкарні ў іншую і вандруючы, такім чынам, з горада ў горад, з краіны ў краіну.

Апрача спецыялістаў у друкарні працавалі дапаможныя работнікі ў якасці падносчыкаў паперы, памагатых і да т. п. Іх набіралі на месцы, і якой-небудзь кваліфікацыі, апрача прыроднай спрытнасці, ад іх не патрабавалася. Друкарні таксама быў патрэбны майстар па рамонту друкарскага абсталя-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вання; звычайна, ён стала пасяляўся ў горадзе, дзе ўзнікала кнігадрукаванне, або нават быў мясцовым ураджэнцам. Невялікія друкарні запрашалі такога майстра час ад часу, а вялікая друкарня магла мець уласнага рамонтніка.

Роля заказчыка ў працэсе друкавання была даволі сціплай. Апрача аплаты (якая, звычайна, уносілася часткамі, але абавязкова існавалі задаткі) ён мусіў здаць у друкарню тэкст кнігі, добрачытэльны і без значных памарак. Таксама ён мусіў здаць гісару малюнкі шрыфтоў (яны заказваліся спецыяльнаму мастаку), калі яго не задавальняў шрыфт, што меўся ў друкарні ад папярэдніх друкаў. Выбар шрыфту залежаў ад фармату і характару выдання, таму з мэтай паляпшэння збыту кнігі часам адлівалі асобны шрыфт, нават калі ранейшы і не быў сапсаваны.

*Малюшына В.А. (Мінск)*

## МАСТАЦКІЯ АСАБЛІВАСЦІ СТАРАДРУКАРСКАГА СТЫЛЮ Ў БЕЛАРУСКІХ ВЫДАННЯХ КІРЫЛІЧНАГА ДРУКУ XVI—XVIII стст.

Мастацкае ўбранства беларускіх старадрукаў, асабліва іх арнаментацыя, захапляе ўсіх, хто цікавіцца нашай старой кнігай. Маляўнічыя застаўкі, ініцыялы, узорыстыя рамкі прыцягваюць увагу высокім майстэрствам выканання. У іх надзвычай яскрава праявіўся талент мастакоў у спалучэнні з вытворчымі магчымасцямі друкароў. Дзякуючы арнаменту, кнігі маюць святочны выгляд, больш зручна ўспрымаецца іх змест.

Як паказваюць назіранні, большасць аздоб у беларускіх выданнях выканана ў старадрукарскім стылі. На працягу некалькіх стагоддзяў матывы гэтага арнаменту ўстойліва пераходзілі з кнігі ў кнігу, яны прыйшліся да спадобы як выканаўцам, так і тым, каму прызначалася кніга. І сёння старадрукарскі арнамент уражвае сваёй прыгажосцю, дасканаласцю, багаццем форм. У навуковай літаратуры падрабязна асветлена яго паходжанне. В.М.Шчэпкін, напрыклад, адзначае, што арнамент складваўся паступова, напачатку ва ўзаемасувязі з матывамі італьянскага Рэнесансу, якія прайшлі перапрацоўку спачатку ў бліжэйшай да нас балканскай пісьмен-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ